**Кантрольная работа (дыктант)**
**для правядзення ўступных іспытаў пры прыёме асоб у VIII клас**
**для атрымання агульнай сярэдняй адукацыі ў кадэцкіх вучылішчах**
**па вучэбным прадмеце «Беларуская мова»**

## Навальніца

Надвор'е на возеры няўстойлівае. Яно часта змяняецца. То цёпла, то холадна. То свеціць сонца, то пахмурна. То ціха, то рэзкі вецер. Часта змяняе свой колер і возера. То яно блакітнае, то цёмна-сіняе, то зялёнае, то шэрае, сярдзітае і непрыгляднае.

З раніцы свяціла сонца. Усё прадказвала добрае надвор'е.

Раптам у ясным небе з'явіліся белыя воблачкі. Іх становіцца ўсё больш. Сярод белых воблачкаў можна цяпер заўважыць і цёмна-шэрыя.

Сонца схавалася.

Дзесьці ўдалечыні пачуліся глухія раскаты грому. Неўзабаве яны зрабіліся больш гучнымі і працяглымі.

Птушкі недзе пахаваліся. Неба зусім пацямнела, завалаклося цяжкімі хмарамі. Нечакана наляцеў парыў ветру. Сосны пахіснуліся і застагналі. Па зямлі імкліва пакаціліся, абганяючы адна адну, сасновыя шышкі. (108 слоў)

*Паводле В. Вольскага*